# ДОБРЫ ДЗЕНЬ, 1965-Ы!

Далоні ў цвёрдых мазалях,
Крупінкі солі на плячах,
Героя зорка на грудзях,
І неба зорнае ў вачах...

Такім быў мінулы, 1964 год, такім увойдзе ён у вякі. Савецкія людзі праводзяць яго з добрымі і радаснымі пачуццямі. Шосты год сямігодкі завершан паспяхова. План прамысловай вытворчасці перавыканан. Парадавалі краіну працаўнікі сельскай гаспадаркі. Дзяржаўныя планы закупак збожжа, цукровых буракоў, бульбы, бавоўны і насення сланечніку не толькі выкананы, але і перавыкананы. Гэтых прадуктаў, а таксама гародніны, фруктаў, тытуню закуплена значна больш, чым у мінулыя гады.

А якія велічныя дасягненні ў галіне навукі, тэхнікі, культуры! Чалавецтва зноў апладзіравала савецкім подзвігам у асваенні космасу.

Нямала слаўных спраў здзейснілі ў мінулым годзе і працоўныя Любаншчыны. Калгаснікі і работнікі саўгасаў вырасцілі добры ўраджай, дамагліся далейшага ўздыму грамадскай жывёлагадоўлі. Раён датэрмінова выканаў планы продажу дзяржаве збожжа, бульбы, цукровых буракоў, махоркі. Намнога больш, чым у папярэднім годзе, прададзена малака і мяса.

Дружна папрацавалі ў мінулым годзе і калектывы прамысловых прадпрыемстваў раёна. Датэрмінова завяршылі свае вытворчыя праграмы Любанскі круxмальны завод, Любанскі і Пагосцкі масласырзаводы, Урэцкі спіртзавод і іншыя.

Асабліва ганарымся мы працоўнымі подзвігамі салігорцаў — будаўнікоў, мантажнікаў, гарнякоў і хімікаў. Напярэдадні Новага года Цэнтральны Камітэт КПБ і Савет Міністраў Беларусі павіншавалі іх з завяршэннем будаўніцтва другой чаргі і ўводам у эксплуатацыю Першага калійнага камбіната на поўную праектную магутнасць.

А вось яшчэ некалькі красамоўных фактаў і лічбаў. У вёсках і гарадскіх пасёлках раёна за 1964 год пабудаваны сотні індывідуальных жылых дамоў і грамадскіх будынкаў, тры сельскія тыпавыя магазіны, тры памяшканні сярэдніх школ і г.д. Узрасла тэхнічная аснашчанасць калгасаў і саўгасаў: машынны парк павялічыўся больш чым на 120 трактараў, на 61 збожжавы камбайн і інш. Яшчэ 9 калгасаў і саўгасаў падключаны да дзяржаўнай электраліній. Сярод іх — сельгасарцелі «Усход», «Будаўнік», «Іскра», імя Суворава.

Нядрэнна папрацаваў 1964. І мы яму гаворым: «Маладзец!»

Сёння ўзяў старт Новы, 1965 год. Пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна савецкі народ даб'ецца новых слаўных перамог ва ўсіх галінах гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, зробіць новы вялікі крок наперад, да запаветнай мэты — да камунізма.

З Новым годам, з новым шчасцем, дарагія таварышы!